в случае отставки, выразивший согласие на осуществление полномочий члена Совета Республики пожизненно, является делегатом ВНС от законодательной власти. Предлагаемое нормотворческое решение согласуется с законодательным регулированием порядка формирования ВНС от местных Советов депутатов и гражданского общества. Так, в ч. 2 ст. 96[3] Избирательного кодекса Республики Беларусь устанавливается, что одно и то же лицо не может являться кандидатом в делегаты ВНС от местных Советов депутатов и от гражданского общества.

Конституционные обновления также затронули порядок досрочного прекращения полномочий Президента в связи со смещением с должности, а также в случае смерти Президента.

Конституция устанавливает, что Президент может быть смещен с должности ВНС в случае систематического или грубого нарушения Президентом Конституции либо совершения государственной измены или иного тяжкого преступления. Конституционным нововведением стало закрепление возможности смещения Президента с должности в случае грубого или систематического нарушения Конституции на основании соответствующего заключения Конституционного Суда Республики Беларусь. Изменился и порядок рассмотрения вопроса о смещении Президента с должности. Ранее этот вопрос разрешался палатами Парламента.

Наделение ВНС полномочием по рассмотрению вопроса о смещении Президента с должности, по мнению автора, обусловлено его особым конституционным статусом как высшего представительного органа народовластия, обеспечивающего незыблемость конституционного строя, преемственность поколений и гражданское согласие. Порядок рассмотрения ВНС предложения о выдвижении обвинения Президенту в систематическом или грубом нарушении им Конституции или совершении государственной измены или иного тяжкого преступления регламентируется Законом о ВНС.

Далее обратимся к конституционным изменениям, связанным с досрочным прекращениям полномочий Президента в связи со смертью. После внесения изменений и дополнений в Конституцию на республиканском референдуме 27 февраля 2022 г. следует различать смерть Президента по причинам насильственного и ненасильственного характера. Это имеет значение для последующего конституционного механизма замещения вакантной должности Президента.

В случае смерти Президента по причинам ненасильственного характера (болезнь, старость и т. п.), также как и в случае его отставки, досрочного освобождения от должности или смещения с должности его полномочия до принесения Присяги вновь избранным Президентом переходят к Председателю Совета Республики (ч. 1 ст. 88[1] Конституции), а не к Премьер-министру Республики Беларусь, как было до обновления Основного Закона.

В случае гибели Президента в результате покушения на его жизнь, совершения акта терроризма, военной агрессии, вследствие иных действий насильственного характера (т. е. смерти по причинам насильственного характера), как отмечают белорусские ученые Н.А. Карпович и О.И. Чуприс, «подлежит применению уникальный конституционно-правовой механизм перехода к Совету Безопасности полномочий по управлению страной» (ч. 2 ст. 88[1] Конституции). Полагаем, речь можно вести о квази коллегиальной президентуре.

Таким образом, обновление Основного Закона Республики Беларусь в части ограничения сроков пребывания в должности и уточнения оснований досрочного прекращения полномочий Президента, по мнению автора, обеспечивает преемственность правового развития, сохранение государственного суверенитета, незыблемость конституционного строя и укрепление народовластия как идеологического императива правовой политики Республики Беларусь.

УДК 351.741(476-89)(091)“18”

***А.Э. Сакольчык***

## ДА ГІСТОРЫІ АДНАГО АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЕКТА Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ ЎРАДНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (80–90-я гг. XIX ст.)

Інстытут ураднікаў узнік у Расійскай імперыі 9 чэрвеня 1878 г., калі было прынята «Временное положение о полицейских урядниках в 46 губерниях, по общему учреждению управляемых». Гэтым законам уводзілася 5 000 новых паліцэйскіх пасад у паветах (у сярэднім па 108 чалавек на адну губерню). Пасля 5 верасня 1879 г. адбылося невялікае ўзбуйненне штату, дадалі яшчэ 550 пасад за кошт дзяржаўнай казны. У цэлым на 5 беларуска-літоўскіх губерняў прыйшлося 657 ураднікаў.

На ўраднікаў ускладаліся вялікія надзеі як на інстытут прафесійнай паліцыі. Заканадаўца меркаваў, што ўраднікі будуць накіроўваць і кантраляваць дзейнасць сельскай паліцыі (соцкіх і дзесяцкіх). Дзейнасць саміх ураднікаў грунтавалася на аснове Інструкцыі, распрацаванай Дэпартаментам паліцыі ў 1878 г. Камплектаванне штату ўраднікаў адбывалася на аснове кантракту з асобамі ўсіх саслоўяў, уключаючы падатковыя.

Ураднікам выдаваліся інструкцыі і спісы мясцовасцяў, за якімі яны назіралі, прызначаліся пункты іх жыхарства з улікам пастаяннага знаходжання па месцы размяшчэння ўчастка. Ураднікаў меркавалася выкарыстоўваць толькі для такіх паліцэйскіх спраў, пры выкананні якіх патрабавалася дастатковая граматнасць, кемлівасць і адпаведная распарадчасць. Падчас прызначэння асобы на пасаду звярталася вялікая ўвага на маральныя якасці. Урад хацеў бачыць на службе аховы правапарадку надта добранадзейных, бескарыслівых, разумных выканаўцаў ускладзеных абавязкаў, людзей дастаткова пісьменных і талковых, якія вядуць цвярозы і самавіты лад жыцця. Ажыццявіць такі падыход намерваліся з дапамогай розных службовых бонусаў, у першую чаргу вызвалення ўраднікаў ад прызыву ў войска і даволі значнага памеру матэрыяльнага забеспячэння (заробак 200 руб. у год, 50 руб. – на абмундзіраванне, 80–100 руб. – на ўтрыманне каня). Але вопыт паказаў, што проста высокай маральнасці і ведання азоў граматы не дастаткова. Тады ва ўрадавых распараджэннях чырвоным радком пачалі праходзіць новыя патрабаванні. Рэкамендавалася замяшчаць урадніцкія вакансіі людзьмі цалкам пісьменнымі і развітымі, лепш за ўсё ніжнімі ваеннымі чынамі запасу.

Сапраўды, узровень граматнасці ўрадніцкага штату пакідаў жадаць лепшага. Напрыклад, па Мінскай губерні ў 1879 г. 57 % службоўцаў паказалі, што нідзе не вучыліся, таму для падрыхтоўкі ўраднікаў былі арганізаваны спецыяльныя школы,

дакладней, курсы. Самая першая школа на тэрыторыі Расійскай імперыі ўзнікла ў Гродне ў 1879 г. па праекце губернатара М.М. Цэймерна. У ёй працаваў выкладчыкам кіраўнік канцылярыі губернатара, вядомы кандыдат права І.П. Малерыус. Дарэчы, у 1880 г. ён нават склаў «руководство» для ўраднікаў. Кніга карысталася папулярнасцю. Так, Мінскі губернатар у студзені 1881 г. даручыў выпісаць яе ўсімураднікам па 50 кап. за экземпляр. Існавала школа і ў Магілёве. Яе планавалася адкрыць 15 верасня 1880 г. Мелася распрацаванае палажэнне школы і смета выдаткаў. У 1888 г. Віцебскі губернатар В.М. Даўгарукі таксама выдаў адукацыйны праект з намерам усеагульнага навучання або стажыроўкі ўраднікаў, таму, хто яго не прайшоў, пагражала звальненне са службы. Не здаўшых іспыт ураднікаў губернатар прапаноўваў адпраўляць на 3 месяцы на вучобу непасрэдна пры павятовым паліцэйскім праўленні.

Справа заставалася толькі за Мінскай губерняй. Відаць, з гэтай нагоды ў канцылярыю Мінскага губернатара М.М. Трубяцкога 28 ліпеня 1888 г. паступіў Цыркуляр з Дэпартамента паліцыі аб арганізацыі падрыхтоўчай службы або школы ўраднікаў. Губернатару нават прыслалі ў якасці прыкладу распрацаваныя ў г. Жытоміры адукацыйны праект школы ўраднікаў і праграму навучання, якая насіла даволі падрабязны характар і ўключала ў сябе курс агульнаадукацыйны і курс спецыяльны. У першы курс уваходзілі: руская грамата (кароткі тэарэтычны курс рускай граматы і практыкаванне ў чытанні, правапісе, чыстапісанні), кароткі курс арыфметыкі да дробаў, кароткая гісторыя Расіі, геаграфія (самае агульнае паняцце аб фізічнай геаграфіі і кароткі курс геаграфіі Расіі).

Спецыяльны курс складаўся з дзвюх частак – агульнай і асаблівай. У першай вывучаліся агульная сутнасць інстытута паліцыі і значэнне яго ў дзяржаве і грамадстве, гісторыя ўзнікнення інстытута ўраднікаў і папярэднія яго недахопы, якія выклікалі распараджэнне МУС 1887 г. і складанне новай інструкцыі, таксама маральныя адносіны паліцэйскіх ураднікаў да насельніцтва, дысцыпліна, дзяржаўныя ўрадавыя і грамадскія (саслоўныя) установы, крымінальнае права («Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1886 г., «Устав о наказаниях, налагаемых Мировыми Судьями» 1864 г.).

Другая частка знаёміла навучэнцаў з новай Інструкцыяй ад 28 ліпеня 1887 г., працэсуальнай вытворчасцю (падставы да пачатку справы, формы данясенняў і пратаколаў, абавязковыя практыванні на зададзеныя тэмы), статутам аб папярэджанні і спыненні злачынстваў, а таксама пашпартным, піцейным, тытунёвым, лясным, будаўнічым, дарожным, пажарным статутамі, з правіламі дапамогі ў няшчасных выпадках, санітарнымі правіламі на выпадак з'яўлення эпідэмічных хвароб, мерамі да папярэджання і спынення падзяжу жывёлы.

Ад курса навучання патрабавалася сцісласць і выкладанне прадметаў у самай папулярнай і яснай форме. Ураднік павінен быў займацца ў школе па 6 гадзін штодзенна, акрамя нядзельных і высокаўрачыстых дзён. Пасля кожных 2 гадзін заняткаў ішоў паўгадзінны перапынак. Правядзенне заняткаў ускладалася на спраўніка і яго памочніка. За маральнымі паводзінамі ўраднікаў належала сачыць станаваму прыставу. Безумоўна, праект выглядаў ідэальна. Але Мінскі губернатар цалкам адмовіўся ад наладжвання школы. Ён абгрунтоўваў сваё рашэнне адсутнасцю сродкаў, бо ў распараджэнні губернскай адміністрацыі адзінай наяўнай крыніцай былі даходы губернскай тыпаграфіі. Акрамя таго, на яго думку, большасць мясцовых ураднікаў мелі выслугу па некалькі гадоў, практычны вопыт і дастатковае веданне паліцэйскай службы, задавальнялі сваёй працай.

Магілёўскі губернатар М.А. Зіноўеў, наадварот, вырашыў у 1893 г. правесці па падобнай праграме новы набор на вучобу. Разгарнулася актыўная падрыхтоўка. Ад ваеннага начальства патрабавалася падаць спісы звольненных у гэтым годзе асоб з жаданнем паступіць у школу і характарыстыкамі ўзроўню пісьменнасці, маральнасці, сямейнага і сацыяльнага становішча, веравызнання, узросту, стаўлення да службы – правесці свайго роду папярэднюю атэстацыю на прыгоднасць да навучання ў школе. Працягваў дзейнічаць крытэрый адбору па веравызнанні – прадстаўнікі каталіцкай канфесіі не прымаліся. Абраныя асобы ніжніх чыноў павінны былі падаць прашэнне на імя губернатара асабістыя дакументы і з'явіцца не пазней за 1 кастрычніка ў канцылярыю. Пакет дакументаў складалі метрычнае пасведчанне, даведка з паліцыі аб адсутнасці судзімасці, сведчанне аб службе і паводзінах, аб адукацыі, звальняльны білет. Курс навучання планаваўся не больш за 2 месяцы, па выніках якога спецыяльнай камісіяй праводзіўся іспыт на веданне паліцэйскай службы. Кандыдаты павінны былі жыць за свой рахунак і пры ўступленні ў пасаду панесці значныя выдаткі на набыццё форменнай вопраткі, добрага каня, рэвальвера і сядла. Пасля навучання пасведчанні не выдаваліся, а неабходныя звесткі канцылярыя губернатара паведамляла ў адказ на паступіўшыя запыты.

Служба ўраднікаў карысталася попытам, і на імя губернатара паступала шмат прашэнняў не толькі ад ніжніх чыноў, але і ад сялян, якія абгрунтоўвалі свае памкненні жаданнем і адчуваннем у сабе здольнасцяў служыць на пасадзе ўрадніка. Пасады вызваляліся рэдка, таму існавалі чэргі на замяшчэнне вакансій, нават сярод ураднікаў, што прайшлі навучанне, асабліва на ўчастку месца пражывання. Пасля доўгага чакання яны дасылалі губернатарам прашэнні з просьбамі знайсці месца працы па ўсёй губерні. Зрэшты, не ўсе адукацыйныя праекты знайшлі практычную рэалізацыю, але сам інстытут урадніцкай службы праіснаваў да 1917 г.

УДК 342

***В.А. Самарин***

## КОНТРРАЗВЕДЫВАТЕЛЬНАЯ РАБОТА В ПАРТИЗАНСКИХ БРИГАДАХ ЛЕНИНГРАДСКОЙ ОБЛАСТИ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Партизанское движение на территории Ленинградской области в предвоенных границах началось с июля 1941 г. и продолжалась до лета 1944 г. Оно отличалось массовостью и организованностью, что в немалой степени было обеспечено контрразведывательной деятельностью сотрудников органов государственной безопасности. Работа по недопущению проникновения в